# Ва ўмовах вайны

## Развіццё беларускай культуры ў 1914–1918 гадах

**Амаль з самага пачатку Першай сусветнай вайны 28 ліпеня 1914 года ў заходніх, у тым ліку беларускіх, губернях прыфрантавой паласы Паўночна-Заходняга фронту было ўведзена ваеннае становішча. У сувязі з гэтым значныя паўнамоцтвы перадаваліся ў рукі ваенных. Уладамі, апроч іншых абмежаванняў для насельніцтва, быў уведзены строгі кантроль над перыядычным друкам і культурнымі ўстановамі.**



**Мікалай ШЧАЎЛІНСКІ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт**

Пастановы, выдадзеныя ў гэты час, падкрэслівалі, што ўсе асобы, у тым ліку і цывільнае насельніцтва, «падлягаюць ваеннаму суду і пакаранню па законах ваеннага часу аж да смяротнай кары: 1) за бунт супраць вярхоўнай улады; 2) наўмысны падпал...» *[1, л. 59]* і г.д. Без дазволу вайсковага начальства забараняўся продаж насельніцтву газет і кніг *[2, с. 596]*.

У гэтых умовах праводзіць якую-небудзь культурна-нацыянальную работу было вельмі цяжка. Набліжэнне расійска-германскага фронту, ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі, добраахвотныя і прымусовыя ўцёкі сотняў тысяч людзей на ўсход яшчэ больш пагоршылі сітуацыю: восенню 1914 года вымушаны быў спыніць сваю дзейнасць часопіс «Лучынка», у студзені 1915 года – «Саха», 30 ліпеня 1915 года – газета «Беларус», а праз тыдзень выйшаў апошні нумар газеты «Наша ніва» *[3, с. 100]*.

Аднак, нягледзячы на цяжкасці ваеннага часу – увядзенне ваеннага становішча, фізічныя і матэрыяльныя страты, мабілізацыю і бежанства, беларуская справа не памерла. Яшчэ ў пачатку 1915 года царскі ўрад дазволіў на Беларусі яўрэйскі і польскі бежанскія камітэты, а з красавіка 1915 года пачала працу створаная ў Вільні дабрачынная арганізацыя «Беларускае таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны», старшынёй якой быў абраны Вацлаў Іваноўскі *[4, л. 1]*. Асноўным напрамкам яе дзейнасці было стварэнне пунктаў харчавання, інтэрнатаў, дзіцячых дамоў, аказанне медыцынскай дапамогі бежанцам.

Пасля акупацыі нямецкімі войскамі восенню 1915 года заходняй часткі Беларусі невялікая група беларускіх дзеячаў, што засталіся ў акупіраванай Вільні, працягвала культурна-нацыянальную работу ў новых умовах. Ужо восенню 1915 года ў горадзе пачаў дзейнічаць Беларускі народны камітэт, які выказваўся за незалежнасць Беларусі і Літвы і адраджэнне ВКЛ. Аднак створаная ім для практычнага вырашэння гэтай задачы Канфедэрацыя Вялікага Княства Літоўскага па аб'ектыўных і суб'ектыўных прычынах распалася *[5, с. 239]*. У чэрвені 1916 года беларускія дзеячы дамагліся афіцыйнага прызнання беларускай мовы нямецкімі акупацыйнымі ўладамі *[6, л. 353]*. На беларускай мове сталі друкавацца пашпарты, заклікі, брашуры. У гэтым жа годзе на акупіраванай частцы Беларусі было адкрыта каля 50 школ *[7, с. 18]*, а ў 1917-м – ужо 126 беларускіх школ *[8, с. 26]*. У студзені 1916 года пачала выдавацца беларуская газета «Гоман», якая адыграла вельмі важную ролю ў нацыянальна-культурным адраджэнні беларускага народа. Значнай

**ПРА АЎТАРА**

ШЧАЎЛІНСКІ Мікалай Барысавіч.

Нарадзіўся ў 1955 годзе ў п. Дзяржынск (з 2003 года – Раманаў) Жытомірскай вобласці (Украіна).
У 1991 годзе скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, у 1995 годзе – аспірантуру БДУ.
З 2000 года – выкладчык кафедры гісторыі, сусветнай і айчыннай культуры Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта.
Кандыдат гістарычных навук (2000), дацэнт (2009).
Аўтар больш як 70 навуковых работ, у тым ліку дзевяці манаграфій.
Сфера навуковых інтарэсаў: грамадска-палітычнае развіццё Беларусі ў пачатку XX стагоддзя; беларускі нацыянальны рух у гады Першай сусветнай вайны; гісторыя стварэння і развіцця грамадзянскай авіяцыі Беларусі.

падзеяй сталася адкрыццё ў Вільні ў чэрвені 1916 года Беларускага клуба, на аснове якога быў арганізаваны тэатр.

Што датычыцца неакупіраванай часткі Беларусі, дык тут таксама нацыянальна-культурны рух у 1915–1916 гадах значна актывізаваўся. У такіх гарадах, як Мінск, Полацк, Віцебск, Смаленск, Магілёў, пачалі ствараца таварыствы, клубы, гурткі. Асноўнымі цэнтрамі гэтых аб'яднанняў інтэлігенцыі і моладзі былі «Беларускія хаткі». У адной з іх, што адкрылася ў Мінску, удзел прымалі Уладзіслаў Галубок, Усевалад Фальскі, Аркадзь Смоліч, Лявон Дубяйкоўскі, Ядвігін Ш. (Антон Лявіцкі), Змітрок Бядуля, Арнольд Паўловіч, Язэп Фарботка, Рамуальд Зямкевіч, Язэп Лёсік, Фабіян Шантыр, Зоська Верас (Людвіка Сівіцкая), Ванда Лявіцкая, Максім Багдановіч і інш. Актывістка беларускага маладзёжнага руху Апалонія Савёнак-Раткевіч так згадвала пра актывістаў мінскай «Беларускай хаткі»: «Гэтыя выдатныя людзі выбралі найвастрэйшую зброю – мастацкае слова. Яны прамаўлялі да нас вуснамі нашых паэтаў-адраджэнцаў... Гэта было для нас і навукай, і клічам, і загадам, і праграмай дзейнасці. Мы бачылі ідэю, тую высокую, велічную ідэю змагання за волю свае Бацькаўшчыны і свайго народу...» *[9, с. 18]*.

Вялікую ўвагу беларускія дзеячы надавалі пытанню аб адкрыцці на неакупіраванай тэрыторыі Беларусі вышэйшай навучальнай установы – беларускага ўніверсітэта. Але Міністэрства народнай асветы Расіі на гэтыя імкненні адказвала адмоўна, бо лічыла немэтазгодным адкрываць універсітэт у Мінску, таму што горад знаходзіўся паблізу фронту, а такія гарады, як Віцебск і Магілёў, не з'яўляліся, згодна з урадавай тэрміналогіяй, цэнтрамі Паўночна-Заходняга краю.

Вялікіх поспехаў адраджэнне беларускай культуры дасягнула пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года. Паўсюль, дзе была нацыянальна свядомая інтэлігенцыя і ініцыятыўная моладзь, пачалі з'яўляцца розныя беларускія арганізацыі, культурна-асветныя таварыствы, аматарскія драматычныя, харавыя, краязнаўчыя і іншыя гурткі.

У сакавіку 1917 года ў Мінску быў створаны Беларускі Нацыянальны Камітэт (БНК), які ў сваёй дэкларацыі выказаў патрабаванне аб нацыяналізацыі беларускай школы *[8, с. 89]*. Для каардынацыі намаганняў творчай інтэлігенцыі па развіцці нацыянальнай культуры і прафесійнага мастацтва пад эгідай БНК было заснавана Таварыства беларускай культуры. 24–25 чэрвеня яно правяло Дні вольнай Беларусі – шырокую акцыю, якой меркавалася ахапіць насельніцтва краю і ўсіх беларусаў па-за яго межамі. У Мінску, Магілёве, Петраградзе і іншых гарадах было наладжана святкаванне Купалля, дэманстраваліся дасягненні нацыянальнага мастацтва, чыталіся рэфераты па гісторыі Беларусі, збіраліся сродкі ў нацыянальны фонд *[5, с. 241]*.

Актыўны ўдзел у адраджэнні нацыянальнай культуры прымалі настаўнікі, якія ў ліпені 1917 года ў Мінску на 2-м з'ездзе прадстаўнікоў беларускіх арганізацый заснавалі Беларускі настаўніцкі саюз *[10]*. Мэтай яго было з'яднанне ўсіх настаўнікаў, якія лічылі сваёй задачай спрыяць нацыяналізацыі беларускай школы – ад пачатковай да сярэдняй і вышэйшай. На з'ездзе таксама зацвердзілі статут саюза, дзе акрэсліваліся яго прызначэнне і задачы.

Важную ролю ў справе нацыянальнага адраджэння таксама адыграў перыядычны друк. У першую чаргу гэта датычыцца газеты «Вольная Беларусь», якая пачала выходзіць у Мінску 28 мая 1917 года як тыднёвік БНК пад рэдакцыяй Я. Лёсіка, а з ліпеня 1917 года стала органам Таварыства беларускай культуры. Газета заклікала да адраджэння краю, добрасуседскіх адносін з Расіяй, Польшчай, Украінай і Літвой пры ўмове прызнання імі


ВОЛЬНАЯ Беларусь

Цэна асобнаго № 15 кап.

Умовы падпіскі на 1917 год.

Умовы друку абвестак:

Газэта палітычная, эканамічная і літэратурная.

№ 3. (Аўторак) Выходзіць двойчы на тыдзень. (20 ...) № 3.

ГРАМАДЗЯНЕ-БЕЛАРУСЫ!

На ліку газэт, кніг і журналаў Беларусь самая бедная у Дзяржаві Расійскай. Наша сьвятая павіннасьць дапамагчы пашыранью друкованага слова.

Беларусы! Злучайцеся у гуртні, ў сяброўствы, зьбірайце грошы на фонд «Вольнае Беларусі», арганізуйце падпіску, шукайце прыхільнікаў, спагадачоў і чытачоў. Памятайце, што, калі мы самі аб сабе ні надбаем, дык ніхто нам ні паможа. Наша справа у нашых руках. Хто дбае, той і мае. Складайце фонд «Вольнай Беларусі»!

РЭДАКЦЫЯ.

НАСТАЎНІЦКІ З'ЕЗД.

нацыянальнай і культурнай самастойнасці Беларусі, вітала Лютаўскую рэвалюцыю, выступала за культурна-нацыянальную і дзяржаўную аўтаномію Беларусі ў складзе будучай дэмакратычнай федэратыўнай Расіі *[5, с. 240–241]*.

У справе пашырэння і паглыблення самасвядомасці беларускага народа моцным сродкам з'яўляўся тэатр. У красавіку 1917 года ў Мінску па ініцыятыве выдатнага дзеяча нацыянальнай культуры І. Буйніцкага было заснавана «Першае беларускае таварыства драмы і камедыі». Яго кіраўнікі – Усевалад Фальскі і Фларыян Ждановіч. Акрамя драматургаў, у склад таварыства ўваходзілі Антук Крыніца, Янка Беларус, Паўліна Мядзёлка, Вера Тарасік, Генрых Грыгоніс, Уладзіслаў Галубок і іншыя *[11, с. 6]*.



УСТАЎНАЯ ГРАМАТА

РАДЫ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ.

Год назад народы Беларусі разам з народамі Расіі скінулі ярмо расійскаго царызму, які найцяжэй прыцісnуу быу Беларусь; ні пытаючыся народу, он укінуу наш край у пажар вайны, якая чыста зруйнавала гарады і вескі беларускіе.

Цяпер мы, Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, скідаем з роднаго краю апошняе ярмо дзяржаунай залежнасьці, якое гвалтам накінулі расійскіе цары на наш вольны і нізалежны край.

Ад гэтаго часу Беларуская Народная Рэспубліка абвешчаецца Нізалежнай і Вольнай Дзяржавай. Самі народы Беларусі, у асобі свайго Установчаго Сойму, пастановяць аб будучых дзяржаўных зьвязях Беларусі.

На моцы гэтаго траціць сілу усе старыя дзяржаўныя зьвязі, якія далі магчымасьць чужому ураду надпісаць і за Беларусь трактат у Берэсьці, што забівае на сьмерць беларускі народ, дзелючы зямлю яго на часткі.

На моцы гэтаго урад Беларускай Народнай Рэспублікі мае увайсьці у адносіны з зацікауленымі старанамі, прапануючы ім пераглядзіць тую часьціну Берэсьцейскаго Трактату, якая датычыць Беларусі, і надпісаць міравую умову з усімі ваеваўшымі дзяржавамі.

Беларуская Народная Рэспубліка павінна абняць усе землі, дзе жыве і мае лічбонную перавагу беларускі народ, а ласьне: Магілеўшчыну, беларускія часьці Меншчыны, Гродзеншчыны (з Гроднай, Беластокам і інш.), Віленшчыны, Віцебшчыны, Смоленшчыны, Чарнігоўшчыны і сумежныя часьці суседніх губерняў, заселеныя беларусамі.

Беларуская Народная Рэспубліка пацьверджывае усе тыя правы і вольнасьці грамадзян і народаў Беларусі, якія абвешчаны Устаўной Граматай ад 9 сакавіка 1918 году.

Абвешчаючы аб нізалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі, Рада яе пакладае свае надзеі на тое, што усе любячые волю народы дапамогуць беларускаму народу у поунай меры здейсьніць яго палітычна-дзяржаўные ідэалы.

Рада Беларускай Народнай Рэспублікі.

Дана у Менску-Беларускім
25 сакавіка 1918 году.

У 1918 годзе палітычная сітуацыя змянілася: у выніку наступлення нямецкіх войскаў у лютым – сакавіку больш за $^2/_3$ тэрыторыі Беларусі, уключаючы Мінск, апынулася пад уладай германскіх акупантаў. У гэтых складаных абставінах беларускія дзеячы працягвалі спробы адраджэння беларускай дзяржаўнасці. 21 лютага 1918 года Выканаўчы камітэт Савета Усебеларускага з'езда надаў сабе ўладныя паўнамоцтвы, стварыў урад – Народны сакратарыят і паведаміў аб гэтым у дзяржаўным дэкрэце, названым Першай Устаўной граматай. Затым, 9 сакавіка таго ж года, у акупіраваным Мінску Выканаўчы камітэт з'езда выдаў Другую Устаўную грамату, якой абвяшчалася Беларуская Народная Рэспубліка (БНР), а выканкам пераўтвараўся ў Раду БНР *[12, л. 100]*. Трэцяй Устаўной граматай, выдадзенай Радай БНР 25 сакавіка, Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчалася незалежнай *[12, л. 100]*. Аднак магчымасці рэалізацыі ідэй нацыянальнай свабоды і дзяржаўнай самастойнасці істотна абмяжоўваліся палітыкай кайзераўскай Германіі, якая займала пазіцыю непрызнання БНР.

Нягледзячы на гэта, у пачатку красавіка Народны сакратарыят абвясціў беларускую мову дзяржаўнай і афіцыйнай мовай БНР. Усе акты, дакументы і перапіска ўрадавых устаноў павінны былі весціся толькі пабеларуску *[13, с. 45–46]*. Разам з мовай Народны сакратарыят вялікае значэнне надаваў стварэнню нацыянальнай школы. У 1918 годзе ў зоне нямецкай акупацыі дзейнічала больш за 350 беларускіх пачатковых школ. У мястэчку Свіслач працавала настаўніцкая семінарыя, у Слуцку, Будславе, Мінску, Навагрудку, Гародні – беларускія гімназіі. З красавіка 1918 года ў Мінску адкрылася Беларуская дзяржаўная кансерваторыя *[14, с. 24]*.

Пэўныя здабыткі займела і беларускае кнігадрукаванне. У Мінску было заснавана выдавецкае таварыства «Заранка», якое займалася выданнем кніг для пачатковай школы, студэнтаў і вучняў вышэйшых школ, а таксама для шырокай публікі. Акрамя таго, у горадзе з 1917 года працавала выдавецтва «Вольнай Беларусі», якое ў 1918 годзе выпусціла пяць кніг. Даволі добра была пастаўлена справа выдання школьных падручнікаў у Вільні. Тут трэба адзначыць

плённую працу Вацлава Ластоўскага, які толькі ў 1918 годзе падрыхтаваў і выдаў дзевяць кніжак. У Вільні таксама працавала друкарня М. Кухты, якая выдала «Беларускую граматыку для школ» Браніслава Тарашкевіча *[15, л. 194]*.

Вялікай падзеяй у культурным жыцці беларусаў стала правядзенне ў маі – жніўні 1918 года гісторыка-этнаграфічнай выстаўкі «Вільня – Менск». Як паведамляла газета «Беларускі шлях», «выстаўка варта таго, каб на яе паглядзелі ўсе, хто любіць нашу мінуўшчыну з яе цэннымі памятнікамі» *[16]*. Там экспанаваліся рэчы, датаваныя аж 1000 годам. Гэта – сцягі, крыжы, гербы беларускіх князёў. Асаблівую ўвагу звярталі на сябе знакаміты «Літоўскі статут», надрукаваны па-беларуску ў 1588 годзе, рыцарскі меч XV стагоддзя, мундзір афіцэра Літоўскага ўланскага палка, штандары Вільні і Трокскага замка.

Шырокага развіцця дасягнуў перыядычны друк. У Мінску па-ранейшаму працягвала сваю дзейнасць газета «Вольная Беларусь». Акрамя яе, выходзілі газета «Беларускі шлях» – орган Менскага беларускага прадстаўніцтва, часопіс «Варта». Усяго ў 1918 годзе пад кантролем Народнага сакратарыята выдавалася больш за 14 газет і часопісаў.

Такім чынам, развіццё беларускай нацыянальнай культуры ва ўмовах Першай сусветнай вайны мела і пэўныя поспехі. Важную ролю ў кансалідацыі беларускага народа адыгралі такія арганізацыі, як Беларускі народны камітэт, «Беларуская хатка», Таварыства беларускай культуры і інш. Упершыню ў гэты перыяд быў створаны Беларускі нацыянальны тэатр, шырокае развіццё атрымалі перыёдыка, кнігадрукаванне, тэатральная самадзейнасць. Усё гэта садзейнічала ўздыму самасвядомасці беларусаў, заклікала іх да актыўнай працы на карысць свайго краю.

## ЛІТАРАТУРА


1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Фонд 705. – Воп. 1. – Спр. 27.
2. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. – Т.2: Беларусь у перыяд капіталізму (1861–1917 гг.). – Мінск, 1972.– 688 с.
3. Гіламёдаў, У.В. Янка Купала. Новы погляд: дапам. для настаўніка / У.В. Гіламёдаў. – Мінск: Народная асвета, 1995. – 176 с.
4. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. – Фонд 3. – Воп.1. – Спр. 101.
5. Парашкоў, С.А. Гісторыя культуры Беларусі / С.А. Парашкоў. – Мінск: Беларуская навука, 2003. – 444 с.
6. НАРБ. – Фонд 60. – Воп. 3. – Спр. 599.
7. Туронак, Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй / Ю. Туронак. – Мінск: Беларусь, 1993. – 236 с.
8. Турук, Ф. Белорусское движение: очерк истории национального и революционного движения белорусов / Ф. Турук. – М.: Госиздат, 1921. – 144 с.
9. Савёнак, А. Калісьці ў Мінску / А. Савёнак // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1991. – № 12. – С.17–19.
10. Вучыцельскі саюз // Вольная Беларусь. – 1917. – 3 жн.
11. Нефед, В. Становление белорусского советского театра / В. Нефед. – Минск, 1965. – 352 с.
12. НАРБ. – Фонд 325. – Воп.1. – Спр. 21.
13. Калубовіч, А. Крокі гісторыі: дасьледаваньні, артыкулы, успаміны / А. Калубовіч. – Беласток; Вільня; Менск, 1993. – 288 с.
14. Мазец, В.Г. Беларускі нацыянальна-культурны рух ва ўмовах нямецкай акупацыі (1917–1918 гг.) / В.Г. Мазец // Гуманітарна-эканамічны веснік. – 1998. – № 4. – С. 22–27.
15. НАРБ. – Фонд 325. – Воп. 1. – Спр. 19.
16. Вільня – Менск // Беларускі шлях. – 1918. – 15 чэрв.



ПОДПИСКА НА ЖУРНАЛ

Идет подписка на «Беларускую думку» на II полугодие 2016 года!

**«БЕЛАРУСКАЯ ДУМКА»**

**74938** – ИНДИВИДУАЛЬНАЯ ПОДПИСКА.

**Стоимость:** 1 мес. – 23 900 руб., 3 мес. – 71 700 руб., 6 мес. – 143 400 руб.

**749382** – ВЕДОМСТВЕННАЯ ПОДПИСКА.

**Стоимость:** 1 мес. – 63 200 руб., 3 мес. – 189 600 руб., 6 мес. – 379 200 руб. (включая НДС).

**СТОИМОСТЬ ЖУРНАЛА ПО ПОДПИСКЕ – ПОЧТИ В 2 РАЗА НИЖЕ РОЗНИЧНОЙ**

Беларуская думка